Выпуск №167 (февраль, 2024)

# Большая перемена




Издается с декабря 2005 года

*Газета государственного учреждения образования «Средняя школа №2 г. Калинковичи»*

*Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам.*

**ЯНКА СІПАКОЎ**

## В ЭТОМ ВЫПУСКЕ

Мова—твая адметнасць. Працяг .............................. 2

Конкурс интеллектуалов «ДетКИ» .......................... 2

Сустрэча з дзяцінствам і юнацтвам ......................... 3

Встреча с ветераном ВС РБ ................................. 4

Эхо Афганской войны ......... 4

Цытаты вядомых людзей .............................. 4

# МОВА—ТВАЯ АДМЕТНАСЦЬ

***15 гадоў запар мы адзначаем Сусветны дзень роднай мовы. Балюча ўсведамляць, што мы гаворым пра родную мову адзін раз на год. І то пра мову, а не на мове. А чаму не гаворым на ёй кожны дзень? Што нам перашкаджае?***

Нікога даўно не здзіўляе той факт, што мы, беларусы, амаль не гаворым на сваёй мове. Яе, як рарытэт, паклалі на паліцы разам са слуцкімі паясамі і дастаём толькі на вялікія святы.

А што такое мова? З аднаго боку – гэта сродак зносін, з другога – прыкмета ідэнтычнасці і самабытнасці народнасці. Мова яднае нас у народ, які носіць прыгожае імя – беларусы. Для нашага народа родная мова – беларуская. Яна з'яўляецца каштоўным дыяментам сярод безлічы моў свету, якую лічаць адной з найпрыгажэйшых у свеце. Яна сучасная і развітая, на ёй лёгка выказаць свае думкі і пачуцці. І пры гэтым усім яна вельмі мілагучная...

У штодзённым жыцці большасць грамадзян гаворыць па-руску, таму што раслі ў рускамоўным асяроддзі і з маленства чулі не родную, а менавіта суседскую мову. Руская мова паўсюдна панавала і пануе сёння ў нашым грамадстве, беларуская знаходзілася і знаходзіцца дзесьці на ўзбочыне і не выкарыстоўваецца сваім жа народам.

Але пры такім становішчы беларускія словы паступова знікнуць, і новыя пакаленні застануцца без унікальнай мовы — сакавітай, багатай, незвычайна пявучай. Адгарніце любы твор беларускага пісьменніка і ўчытайцеся ў словы. Як прыгожа апісваецца прырода Беларусі, як тонка перадаюцца адценні чалавечых пачуццяў. Толькі беларуская мова здольна размежаваць "любовь к девушке" і "любовь к сосискам" з дапамогай розных слоў: каханне і любоў.

І я, дарослы ўжо чалавек, доўга не магла наважыцца размаўляць на роднай мове ў грамадскіх месцах: у магазіне, у транспарце, на працы. Нешта ў сярэдзіне мяне самой увесь час стрымлівала. Можа, ад празмернай увагі людзей. Але ж я здолела перамагчы сябе. І ўсё часцей і часцей кажу на роднай мове. І якая ж рэацыя людзей? У большасці сваёй усміхаюцца, некаторыя кажуць, што прыемна чуць беларускую мову. Праўда, некаторыя перапытваюць. Але гэта, я думаю, ад нечаканасці.

*Працяг на старонцы 2*

**ДЗЕНЬ РОДНАЙ МОВЫ**

# МОВА—ТВАЯ АДМЕТНАСЦЬ

**ПРАЦЯГ. ПАЧАТАК НА СТАРОНЦЫ 1**

Таму звяртаюся да тых, хто хацеў бы размаўляць на роднай мове, але па нейкіх прычынах не робіць гэтага. Пасля таго, як вы пераадолееце ў сабе гэту няўпэўненасць, вы здзівіцеся, якую асалоду ў выніку атрымаеце, як многа знойдзеце!

А тым, хто ніколі нават не задумваўся, на якой мове яму размаўляць, хачу прыгадаць словы Францішка Багушэвіча: ***«Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш мову сваю, так як той чалавек перад скананнем, катораму мову займе, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!»***

Кожны чалавек павінны памятаць, што валоданне беларускай мовай – гэта не «неабавязковы дадатак», гэта тое, што ў сукупнасці з нашай культурай і гісторыяй дае нам права звацца беларусамі.



*Фотаакцыя «Мова—тое, што нас аб'ядноўвае»*

Зберагчы беларускую мову і пашырыць асяродак яе ўжывання – гэта наш прамы абавязак перад самімі сабой і наступнымі пакаленнямі.

***Т.П. Макарэвіч***

**КОНКУРС**

# КОНКУРС ИНТЕЛЛЕКТУАЛОВ «ДетКИ»

***12 февраля 2024 на базе СШ №8 г. Калинковичи состоялся районный этап областного интеллектуального конкурса «ДетКИ». В нем приняли участие 11 команд третьеклассников из гимназии, городских и сельских школ.***



После жеребьевки и приветствия ребят ждали три тура: разминка, представляющая из себя 24 вопроса по предмету «Человек и мир», учебное исследование по математике и интеллектуальная игра, цель которой – проверить знания по белорусскому языку и русской литературе. Как пояснили члены жюри, по всем учебным предметам, кроме математики, задания не выходили за рамки учебной программы, но все они требовали от участников крепких, уверенных и качественных знаний.

В итоге яркой борьбы Диплом победителя, переходящий символ «Мудрая сова» и возможность представлять наш район на области достались команде «Совята» из гимназии.

Второе место разделили команды «Эрудит» из Озаричской СШ и «Кот ученый» из Дудичской СШ, третье – Алые паруса» из СШ №6, «Клёк» из СШ №1 и **«Мудрые совята» из СШ №2.**

***Редколлегия***



# СУСТРЭЧА З ДЗЯЦІНСТВАМ І ЮНАЦТВАМ



***Вечар сустрэчы выпускнікоў заўсёды вельмі кранальнае і прыемнае свята для ўсіх. Гэта дзень, калі можна зноў убачыць сваіх аднакласнікаў, настаўнікаў, зноў акунуцца ў атмасферу школьнага жыцця.***

3 лютага 2024 года ў сярэдняй школе №2 г. Калінкавічы прайшоў вечар сустрэчы. У зале прысутнічалі выпускі розных гадоў. Прыемна здзівілі 10-ці і 30-гадовыя выпускі. Яны найбольш былі прадстаўленыі, што кажа пра сапраўднае школьнае сяброўства. Былі сярод выпускнікоў і тыя, хто закончыў школу 44 гады назад. Дарэчы, з’ехаліся яны, каб сустрэцца з юнацтвам, з самых розных куткоў Беларусі. А тыя, хто не змог прыехаць, даслалі свае відэапрывітанні. Прысутнічалі на вечары і выпускнікі мінулага года. Яны распавялі, як прайшла іх першая сесія. Госці пажадалі нашым цяперашнім вупускнікам большай упэўненасці ў сабе, добрай самаацдачы, а настаўнікам вялікага цярпення. Былым вучням школы было цікава зноў прайсці ў родны клас, апынуцца сярод старых сяброў, аднакласнікаў і даведацца шмат новага і цікавага пра жыццё кожнага. Гэты вечар вярнуў у мінулае і дапамог успомніць школьныя гады: хто з кім разам вырас, з кім сядзеў за адной партай, выступаў на школьных вечарах і нават прагульваў урокі. Хтосьці узгадаў, як падпальваў парту, а хтосьці – як начамі сядзеў і вучыў урокі.

Выпускнікоў розных гадоў вітаў дырэктар школы М.А. Мельнік, які падзякаваў выпускнікоў за тое, што не забываюць родную школу, пажадаў прыемнага вечара і добрых успамінаў.






*10-гадовы выпсук з класнымі кіраўнікікамі Кротавай Аленай Уладзіміраўнай, Студзенікінай Святланай Анатольеўнай*

Акунуцца ў мінулае выпускнікам дапамаглі вучні 11 класа і педагогі школы, арганізаваўшы канцэртную праграму, у якой удзельнічалі і госці.

Хочацца адзначыць, што вечар сустрэчы выпускнікоў заўсёды быў, ёсць і будзе святам, прысвечаным радасным сустрэчам, прыемным успамінам і падвядзенню вынікаў дасягненняў у сваім жыцці.

***Таццяна Амельчук***

Тираж 30 экземпляров



ГУО «Средняя школа №2
г. Калинковичи»

Адрес школы: 247710,
г. Калинковичи
Гомельской области,
ул. Пионерская, 27 Б

Телефон: 2 - 38 - 84

Email:
guo.sosh2@kalinkovichi.gov.by

http://k-soch-2.schools.by

Учредители:
Администрация
ГУО «Средняя школа №2
г. Калинковичи»,
Совет Школы

Мы вместе!

## ЦЫТАТЫ ВЯДОМЫХ ЛЮДЗЕЙ

***Я – беларус, мая родная мова – беларуская.***

**Васіль Быкаў**

* * *

*Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову.*

**Якуб Колас**

* * *

***Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў.***

**Уладзімір Караткевіч**

* * *

*Хто не паважае родную мову, не паважае родны народ.*

**Іван Мележ**

* * *

***Яно добра, а нават і трэба знаць суседскую мову, але найперш трэба знаць сваю.***

**Францішак Багушэвіч**

## УРОКИ МУЖЕСТВА

# ВСТРЕЧА С ВЕТЕРАНОМ ВС РБ

***В преддверии Дня защитника Отечества и Вооружённых сил Республики Беларусь состоялась встреча учащихся 11 класса с ветераном Вооружённых сил Республики Беларусь ракетных войск стратегического назначения, подполковником Шмелёвым Александром Михайловичем.***



В ходе встречи Александр Михайлович рассказал об истории формирования белорусской армии, с чего всё начиналось, откуда берёт начало праздник 23 февраля, о своей профессии офицера, о допризывной подготовке, о преимуществах службы в ВС РБ, провёл викторину по песням военной тематики.

Старшеклассники поблагодарили ветерана за интересный рассказ, факты из личной жизни, пожелали ему крепкого здоровья.

***Анна Лавда***

# ЭХО АФГАНСКОЙ ВОЙНЫ

***7 февраля 2024 года в нашей школе состоялась встреча учащихся с воинами-интернационалистами Пилипейко Михаилом Михайловичем и Вакуленко Анатолием Сергеевичем. Встреча была приурочена к 35-летней годовщине вывода войск из Афганистана.***



Подготовила мероприятие руководитель по военно-патриотическому воспитанию Е.Е. Баранова.

В ходе встречи гости поделились своими воспоминаниями во время пребывания в Афганистане и выполнения интернационального долга. Обучающиеся школы с большим вниманием слушали выступления воинов-афганцев, которые прошли испытание войной. Слушая рассказы о боевых эпизодах войны, ребята представляли, через какие тяготы пришлось пройти солдатам, какие трудности выпали на долю молодых необученных парней, прежде чем они стали мужественными воинами.

Учащимся показали фильм о войне в Афганистане. Школьники прочли стихи и спели о войне, почтили память погибших воинов-интернационалистов минутой молчания.

В завершение мероприятия ее участники сделали общую фотографию на память.

***Виктория Гадлевская***

Ответственный за выпуск Макаревич Т.П.